**УДК 347 [172+18]**

**К.Я. Гярлоўская**
*(Міжнародны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва, аспірант Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта)*

# ПАРАЎНАЛЬНА-ПРАВАВЫЯ АСПЕКТЫ РАЗВІЦЦЯ ІНСТЫТУТА ПРЫЗНАННЯ ГРАМАДЗЯНІНА БЕЗ ВЕСТАК АДСУТНЫМ

*Разгледжаны пытанні развіцця інстытута прызнання грамадзяніна без вестак адсутным, праводзіцца характарыстыка сучаснага заканадаўства замежных дзяржаў у доследнай галіне. Аўтарам зроблены высновы пра наяўнасць агульных каранёў у прававым рэгуляванні доследных адносін у сучасных заканадаўствах. Разам з тым канстатуецца наяўнасць нацыянальных асаблівасцяў, якія ўплываюць на заканадаўствы адпаведных дзяржаў.*

Інстытут прызнання грамадзяніна без вестак адсутным не з'яўляецца новым як для Беларусі, так і для замежных дзяржаў, якія адносяцца да розных прававых сем'яў. Аднак аналізуемы інстытут існуе не ўсюды, а там, дзе ён прысутнічае, яго нормы часам істотна адрозніваюцца ад нормаў беларускага заканадаўства ў частцы ўмоў, тэрмінаў і наступстваў прызнання грамадзяніна адсутным без вестак.

Вытокі інстытута прызнання грамадзяніна без вестак адсутным сфармаваліся яшчэ ў сярэдневяковай Еўропе, дзе былі створаны дзве прававыя канструкцыі: сілезская і саксонская сістэмы [1, с. 151]. Для першай было характэрнае сканчэнне пэўнага тэрміну адсутнасці асобы без звестак пра яе, што з'яўлялася дастатковай падставай да змены статусу такой асобы ў дадзенай мясцовасці; для другой – дасягненне пэўнага веку асобы, якая адсутнічае, для мэт усталявання прэзумпцыі яе смерці. Менавіта саксонская і сілезская сістэмы аказвалі свой уплыў на развіццё аналізуемага інстытута ў прававых сістэмах еўрапейскай часткі кантынента [2, с. 428]. Разам з тым, нягледзячы на агульнасць крыніц паходжання адпаведных правілаў, пры далейшым развіцці права розныя дзяржавы па-свойму сталі мадэляваць уласныя прававыя нормы адносна ўмоў прызнання і статусу асобы, звесткі пра якую адсутнічаюць у пэўнай мясцовасці, звычайнай для яе папярэдняга знаходжання.

Аналізуя французскае заканадаўства, трэба заўважыць, што яно не ведае інстытута абвяшчэння грамадзяніна памерлым, затое яно рэгулюе адносіны прызнання грамадзяніна без вестак адсутным. Так, з цягам часу парадак прызнання асобы без вестак адсутнай, змешчаны ў Французскім грамадзянскім кодэксе 1804 г., [3] (далей – ФГК) зведаў шмат трансфармацый у параўнанні з першапачатковым варыянтам. У цяперашні час ФГК замацаваў два этапы прызнання грамадзяніна без вестак адсутным: 1) усталяванне прэзумпцыі адносна асобы аб яе адсутнасці без вестак; 2) наўпростае абвяшчэнне адсутнага без вестак адсутным з усталяваннем адпаведных прававых наступстваў.

Так, у адпаведнасці з артыкулам 112 ФГК спецыялізаваны суд па справах апекі па патрабаванню адпаведнай зацікаўленай асобы або дзяржаўнай установы можа вынесці рашэнне пра судовае ўстанаўленне прэзумпцыі ў дачыненні да асобы аб факце яе адсутнасці без вестак.

Для забеспячэння правоў і інтарэсаў адсутнай асобы суд мае права вызначыць суб'екта для ажыццяўлення прадстаўніцтва такой асобы ў яе правах, а таксама розных актах, у якіх адпаведная асоба магла быць зацікаўлена. Такі прадстаўнік можа быць нададзены правам кіравання ўсёй ці часткай маёмасці прадстаўляемай ім адсутнай асобы (арт. 113 ФГК). Да ліку прызначаных прадстаўнікоў, зазвычай, адносяць сваякоў, што аднак не выключае магчымасці прызначэння ў якасці прадстаўніка і іншай асобы, калі да гэтага ёсць патрэба.

У выпадку з'яўлення асобы, абвешчанай раней без вестак адсутнай, маёмасць, што ёй належала, вяртаецца ў тым жа аб'ёме, у якім яна знаходзілася да знікнення такой асобы. Пры гэтым, асобе павінна быць вернута сума адчужанай у яе карысць маёмасці. Другім нязменным вынікам яўкі асобы з'яўляецца ануляванне прадпісанняў адносна кіравання і прадстаўніцтва інтарэсаў адсутнага іншым суб'ектам. Прыняцце такіх рашэнняў з'яўляецца абавязкам суда, што адкрыта ці ўскосна аб’ядноўвае заканадаўствы ўсіх дзяржаў, якія прызнаюць аналізуемы інстытут.

Што да досведу Германіі, то трэба адзначыць Германскае грамадзянскае ўлажэнне [4], у якім распрацавана сістэма, дзе зацікаўленым суб'ектам прапаноўваецца магчымасць праз суд аб’явіць пра адсутнасць без вестак пэўнага грамадзяніна і прыняць неабходныя меры для аховы і абароны маёмасці такой асобы. Аднак неабходна даць агульную заўвагу адносна таго, што само па сабе прызнанне грамадзяніна адсутным замяняецца магчымасцю абвяшчэння памерлым па факце адсутнасці без вестак.

Фармулюючы агульнае правіла, германскі заканадавец вызначыў і сістэму выключэнняў з яго. Так, агульным выступае палажэнне пра тое, што па сканчэнні не меней чым дзесяці гадоў з дня апошніх звестак пра асобу з'яўляецца магчымасць прызнання асобы памерлай па факце адсутнасці звестак пра яе. Аднак такое патрабаванне можа быць заяўлена не раней, чым адпаведнай адсутнай асобе споўніцца дваццаць пяць гадоў ад яе народзінаў. Пры сукупнасці дадзеных дзвюх умоў фізічная асоба можа быць абвешчана памерлай.

Але, калі гаворка ідзе пра асобу старога ўзросту, германскім заканадаўствам устаноўлена, што калі да моманту вынясення адпаведным судом рашэння пра абвяшчэнне грамадзяніна памерлым, апошняму б споўнілася 80 гадоў, то тэрмін адсутнасці звестак пра асобу можа складаць пяць гадоў – гэта азначае палову агульнага ўсталяванага тэрміну.

Так, апроч пералічаных правілаў, у заканадаўстве Германіі вызначаны і больш скарочаныя тэрміны для шэрагу спецыфічных жыццёвых сітуацый. Напрыклад, для службоўцаў у арміі ці іншых асобаў, якія знаходзяцца ў войсках, задзейнічаных у мілітарызаваных дзеяннях, германскі заканадавец прадпісвае ў якасці мінімальна дапушчальнага тэрміну адсутнасці звестак адзін год. Адпаведны гадавы тэрмін неабходна вылічаць з моманту падпісання мірнай дамовы, як фармальна-лагічнага сканчэння вайсковых дзеянняў [5, с. 261]. Калі ж адсутнасць чалавека абумоўлена прычынамі, звязанымі з такім няшчасным выпадкам, як крушэнне марскога судна, на якім знаходзіўся грамадзянін, што згінуў без весткі, тэрмін недасведчанасці павінен складаць не меней за шэсць месяцаў, а, напрыклад, тэрмін у тры месяцы ўстаноўлен пры аварыі самалёта.

У сучаснай Іспаніі паводле артыкула 183 Грамадзянскага кодэкса [6] грамадзянін можа быць прызнаны без вестак адсутным падчас выканання шэрагу ўмоў. Па-першае, павінен прайсці год ад таго дня, калі былі апошнія звесткі пра яго і далей – не былі. Другой умовай з'яўляецца факт таго, што адсутны не пакінуў замест сябе свайго паверанага з паўнамоцтвамі па кіраванні ўсёй яго маёмасцю. Альтэрнатыўным правілам выступае тое, што пасля трох гадоў адсутнасці асобы і звестак пра яе ці незалежна ад таго, дазволіў адсутны каму-небудзь кіраваць ўсёй яго маёмасцю, адсутная асоба можа таксама быць абвешчана без вестак адсутнай з адпаведнымі прававымі наступствамі. Дадзены дуалізм правілаў не з'яўляецца выключнай прэрагатывай іспанскага заканадаўства, ён таксама вядомы іншым дзяржавам з іх уласнымі асаблівасцямі.

Грамадзянскае заканадаўства Рэспублікі Малдова змяшчае тоесныя з беларускім заканадаўствам нормы, якія адлюстроўваюцца ў адсутнасці звестак пра асобу ці ж месцы яе знаходжання па месцы яе жыхарства не меней за адзін год са дня атрымання апошніх дадзеных (арт. 49 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Малдова (далей – ГК Рэспублікі Малдова) [7]). Неабходна адзначыць, што супадаюць і правілы вызначэння адпраўнога моманту для вылічэння гадавога тэрміну адсутнасці звестак пра асобу. Як у беларускім і шматлікіх іншых заканадаўствах, у заканадаўстве Малдовы таксама рэгламентаван непасрэдна толькі судовы парадак разгляда дадзеных пытанняў.

Неабходна заўважыць, што паводле палажэнняў п. 2 арт. 50 ГК Рэспублікі Малдова прызнанне фізічнай асобы без вестак адсутнай не выклікае для такой асобы нівелявання яе правоў і абавязкаў. Пры наяўнасці страт, прычыненых неналежным кіраваннем маёмасцю адсутнага, пры яўцы апошняга ён надзяляецца правам запатрабаваць ад давернага кіраўніка, які неналежным чынам кіраваў яго маёмасцю, пакрыцця страт, абумоўленых неналежным кіраваннем даручанай маёмасцю (п. 2 арт. 51 ГК Рэспублікі Малдова). На падставе прыведзеных палажэнняў можна зрабіць выснову, што заканадавец Рэспублікі Малдова ў большай ступені арыентаваны на ахову інтарэсаў і абарону маёмасці без вестак адсутнай асобы.

Аналагічныя нормы, напрыклад, датычныя пытанняў судовага прызнання грамадзяніна без вестак адсутным, тэрміну такога прызнання (на працягу аднаго года адсутнічаюць звесткі аб месцы яго знаходжання па месцы яго пастаяннага пражывання з моманту знікнення) змяшчаюцца ў Грамадзянскім кодэксе Расійскай Федэрацыі.

Такім чынам, праведзенае даследаванне дазваляе сфармуляваць наступныя высновы:

1. Спецыфіка інстытута прызнання грамадзяніна без вестак адсутным абумоўлівае асаблівасці розных грамадзянскіх праваадносін. Ён адлюстроўвае свае нацыянальныя звычаі і асаблівасці, характэрныя для кожнай дзяржавы.

2. Шэраг краін, такіх як Рэспубліка Беларусь, Расійская Федэрацыя, Рэспубліка Малдова змяшчаюць у сваіх заканадаўствах падобныя прававыя нормы ў дачыненні да аналізуемых адносін. Разам з тым інстытут прызнання грамадзяніна без вестак адсутным у кожнай з пералічаных дзяржаў мае ўласныя адметныя рысы.

3. Палажэнні беларускага заканадаўства па пытаннях прызнання грамадзяніна без вестак адсутным успрынялі базавыя тэзы раней сфармаванага еўрапейскага заканадаўства. Разам з тым у мэтах распрацоўкі і прыняцця эфектыўных прававых нормаў у доследнай галіне грамадскіх адносін прапаноўваецца рэцэпцыя правілаў аб павелічэнні заканадаўчай абароненасці правоў і інтарэсаў адсутнага, у прыватнасці:

3.1 устанаўленне прадстаўніцтва адсутнай асобы;

3.2 фармаванне стадый рэалізацыі працэдуры прызнання без вестак адсутным;

3.3 ажыццяўленне вопісу маёмасці, што належала адсутнаму без вестак.

**Спіс выкарыстанай літаратуры:**


1. Калинин, Д. В. История институтов признания гражданина безвестно отсутствующим и объявления умершим в российском и зарубежном праве / Д. В. Калинин // Правовые проблемы организации интеллектуальной деятельности в вооруженных силах Российской Федерации: сб. ст. науч.-практ. конф., Москва, 15 окт. 2021 г. / Воен. ун-т М-ва обороны Рос. Федерации. – М., 2021. – С. 151–154.
2. Киикбаева, А. Р. Становление и развитие института признания гражданина безвестно отсутствующим / А. Р. Киикбаева, С. К. Бадамшин // Научно-практический электронный журнал «Аллея Науки». – 2017. – № 11. – С. 427–430.
3. Французский гражданский кодекс 1804 г. (Кодекс Наполеона) [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikisource.org/wiki/Кодекс Наполеона. – Дата доступа: 29.10.2023.
4. Гражданское уложение Германии [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikisource.org/wiki/Германское гражданское уложение. – Дата доступа: 30.10.2023.
5. Цыбизова, Н. А. Формирование института безвестного отсутствия в некоторых странах Европы / Н. А. Цыбизова // Актуальные вопросы развития юридической науки и практики в современных условиях: сб. ст. по материалам международ. науч.-практ. конф. / под ред. М. Н. Рахваловой. – Новосибирск: изд-во НГТУ, 2017. С. 258–264.
6. Гражданский кодекс Испании [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://4ru.es/ru/knowledge_base/zakonspain/item. – Дата доступа: 03.11.2023.
7. Гражданский кодекс Республики Молдова [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://base.spinform.ru. – Дата доступа: 04.11.2023.


**УДК 343.9**

**Р.Н. Говорко**

*(Международный университет «МИТСО»)*

# ОСОБЕННОСТИ И СУЩНОСТЬ ДОГОВОРА МЕНЫ И ЕГО ПРАВОВОЕ РЕГУЛИРОВАНИЕ

*Данная статья посвящена рассмотрению некоторых вопросов правового регулирования договора мены по законодательству Республики Беларусь и выработке соответствующих рекомендаций по совершенствованию норм гражданского законодательства в данной сфере. В статье подробно рассмотрены и охарактеризованы два понятия: договор мены и бартерная сделка.*

Среди договоров по передаче имущества в собственность, наряду с договором купли-продажи, особое место занимает договор мены.